Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За сталінскія кадры

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 13 (199) | Пятніца, 11 чэрвеня 1954 года | Цана 20 кап.

СОВЕЦКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЗЫКА

Унутраная палітыка Комуністычнай партыі і Совецкага ўрада накіравана на далейшае ўмацаванне магутнасці социялістычнай дзяржавы, саюза рабочага класа і калгаснага сялянства, вялікай дружбы народаў СССР, на ўсямернае развіццё эканомікі і культуры нашай Радзімы і забеспячэнне хуткага росту добрабыту совецкага народа. Гэта палітыка знаходзіць сваё яркае выражэнне ў дзяржаўным бюджэце СССР на 1954 год, прынятым у красавіку бягучага года сесіяй Вярхоўнага Совета СССР.

Агульны аб'ём дзяржаўнага бюджэта СССР на 1954 год па даходах складае 572 мільярды 542 мільёны рублёў і па расходах 562 мільярды 42 мільёна рублёў.

Сродкі дзяржаўнага бюджэта накіроўваюцца на далейшае развіццё народнай гаспадаркі, на социяльна-культурныя мерапрыемствы, на абарону краіны і іншыя патрэбы дзяржавы.

Галоўнай крыніцай даходаў дзяржаўнага бюджэта СССР з'яўляюцца планавапынное павелічэнне вытворчасці социялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, рост таварообароту, рост вытворчасці працы, зніжэнне сабекошту прадукцыі, павышэнне рэнтабельнасці прадпрыемстваў, г. зн. даходы ад социялістычнай гаспадаркі. Так у бюджэце на 1954 год даходы ад социялістычнай гаспадаркі састаўляюць 497 мільярдаў 259 мільёнаў рублей, або 86,9 працэнта ўсіх даходаў бюджэта.

Аднак для забеспячэння павышэння прыбыткаў бюджэта Совецкая дзяржава выкарыстоўвае і дадатковыя крыніцы. Адной з дадатковых крыніц прыбыткаў бюджэта з'яўляюцца дзяржаўныя пазыкі.

Дзяржаўныя пазыкі ў СССР прадстаўляюць сабой форму добраахвотнага ўдзелу працоўных мас сваімі зберажэннямі ў фінансаванні народнай гаспадаркі. Асабістыя зберажэнні, якія прадастаўлены працоўнымі ў пазыку сваёй дзяржаве, з'яўляюцца хоць і дадатковай, але важнай крыніцай забеспячэння пастаянна растучых матэрыяльных і культурных патрэбнасцей працаўнікоў социялістычнага грамадства.

Пазыкі ў СССР размяркоўваюцца сярод насельніцтва. У сучасны момант ўсе пазыкі выйгрышныя, па якіх частка аблігацый выйграе, а астатнія пагашаюцца па іх названай каштоўнасці. Пагашэнне дзяржаўных пазык і выплата выйгрышаў па іх адбываюцца за кошт сістэматычна растучых накапленняў социялістычнай гаспадаркі і забяспечваюць рэгулярны дадатковы прыбытак працоўным. Так, у 1954 годзе агульная сума выплат трымальнікам аблігацый (выйгрышы і аплата названай каштоўнасці аблігацый) складае 10,5 мільярда рублёў пры агульнай суме пазыкі ў 16 мільярдаў рублёў.

Асноўны прынцып пазыкі—строгая добраахвотнасць. Як і ў мінулым годзе, у гэтым годзе падпіска на пазыку сярод рабочых праводзіцца з разліку іх двухтыднёвага заработку, г. зн. 46,2 працэнты, а сярод служачых і ваеннаслужачых—з разліку іх поўмесячнага заработку, г. зн. 50 працэнтаў месячнага заработку. У гэтых межах рабочы і служачы можа падпісацца на любую суму.

Падпісваючыся на дзяржаўную пазыку, кожны совецкі чалавек ведае, што сродкі, якія адданы ім у пазыку дзяржаве, пойдуць на далейшае ўмацаванне магутнасці нашай Радзімы, на далейшае павышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню нашага народа. У гэтым залог поспеху новай пазыкі.

Ф. БАРАВІК.

ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСКВІТ ЛЮБІМАЙ РАДЗІМЫ

9 чэрвеня ў самай вялікай аўдыторыі універсітэта сабраліся студэнты, выкладчыкі, адміністратыўна-гаспадарчыя работнікі. З вялікай увагай яны праслухалі паведамленне аб выпуску новай Дзяржаўнай пазыкі і аб умовах яе размяшчэння.

Мітынг пачаўся адразу-ж пасля паведамлення па радыё аб Дзяржаўнай пазыцы на 1954 год.

Першым слова бярэ тав. Леўко. Ён расказвае прысутным аб значэнні новага займа для далейшага развіцця нашай краіны. Прызыў т. Леўко дружна падпісацца на Дзяржаўную пазыку прысутныя сустрэлі дружнымі воплескамі.

На трыбуну падымаецца студэнтка хімічнага факультэта Аленіцкая.

— Новая пазыка, — гаворыць яна,—гэта новыя заводы і фабрыкі, гэта новыя дамы ў нашым родным Мінску. У імя нашага шчасця, у імя далейшага росквіту любімай Радзімы я падпісваюся на новую Дзяржаўную пазыку.

Затым ад імя адміністратыўна гаспадарчых работнікаў выступіў тав. Зайцаў. Ён сказаў, што пазыка 1954 года, як і папярэднія пазыкі, накіравана на далейшае развіццё нашай гаспадаркі. Мы ведаем, што наша дзяржава, як руплівы гаспадар, усе сродкі пусціць на паляпшанне нашага добрабыту, на ўмацаванне сваёй магутнасці.

Мы ганарымся тым, што ўносім свой пасільны ўклад у справу ўмацавання сваёй дзяржавы. Мы з радасцю аддаем свае працоўныя зберажэнні для далейшага росквіту любімай Радзімы.

Адразу-ж пасля мітынга разгарнулася падпіска. Ужо ў першыя 2 гадзіны падпісалася пераважная большасць студэнтаў, выкладчыкаў і адміністратыўна-гаспадарчых работнікаў.

У асноўным да вечара падпіска была закончана.

Гэтым калектыў універсітэта яшчэ раз выказаў сваю гарачую любоў да Радзімы і адданасць Комуністычнай партыі.

Вытворчая практыка нашых студэнтаў

* * *

НА ПЯРЭДНІ КРАЙ

У арганізацыі вытворчай практыкі ў нас да апошняга часу быў такі сур'ёзны недахоп: пераважная большасць студэнтаў асядала ў рэспубліканскіх і абласных газетах, а ў раённых аказваліся толькі адзінкі. Няведанне жыцця ў раёне вельмі адмоўна сказвалася на падрыхтоўцы выпускнікоў да самастойнай работы ў раённых газетах, куды іх накіроўвалі пасля заканчэння універсітэта.

У сучасны момант гэтая справа карэнным чынам змянілася. Па ўказанню аддзела прапаганды і агітацыі пры ЦК КПБ кафедра тэорыі і практыкі совецкага друку накіроўвае ўсіх студэнтаў у раённыя газеты для праходжання практыкі ў перыяд чэрвень—верасень бягучага года (на працягу ад аднаго да двух месяцаў).

У першую чаргу практыку праходзяць студэнты, якія закончылі праграму чацвертага курса. Некалькі пазней паедуць студэнты, якія закончылі другі курс.

Упершыню ў гісторыі аддзялення журналістыкі едзе такая вялікая колькасць студэнтаў у раён. У гэтай сувязі да месца напомніць, што ў грандыёзнай барацьбе партыі і совецкага народа за выкананне рашэнняў вераснёўскага і лютаўска-сакавіцкага Пленумаў ЦК КПСС на раённыя газеты ўскладзены вялікія і адказныя задачы. Раённы друк—найбольш масавы атрад совецкай прэсы—заклікан па-баявому, ініцыятыўна асвятляць самаадданую працу калгаснікаў, работнікаў МТС і соўгасаў, умела прапагандаваць перадавы вопыт, востра і пераканаўча крытыкаваць недахопы ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве на сяле.

Прабыванне студэнтаў на практыцы ў гарачую пару правядзення важнейшых сельскагаспадарчых кампаній будзе сур'ёзнай дапамогай рэдакцыям раённых газет, канкрэтнай формай удзелу калектыва нашага універсітэта ў барацьбе за рэалізацыю важнейшых пастаноў партыі і ўрада. Разам з тым студэнты пройдуць добрую школу вывучэння жыцця калгаснага сяла, актыўнага ўдзелу ў ім. Гэтая практыка дапаможа студэнтам набыць навыкі, вопыт работы ў рэдакцыях раённых газет, яны адчуюць сябе больш свядомымі і больш падрыхтаванымі для будучай самастойнай работы ў гэтым важным звяне совецкага друку.

Пажадаем студэнтам-журналістам паспяховай работы, творчых поспехаў на вытворчай практыцы ў раённых газетах.

М. С. ЗЯРНІЦКІ,
загадчык кафедры тэорыі і практыкі совецкага друку.

*

Практыка хімікаў

У бягучым годзе студэнты IV курса хімічнага факультэта вытворчую практыку праходзяць на Ленінградскім заводзе «Чырвоны хімік», Харкаўскім заводзе арганічных рэактываў, Салікамскім хімічным камбінаце, Сталінскім заводзе хімічных рэактываў і Калушскім калійным камбінаце. Гэтыя перадавыя прадпрыемствы айчыннай хімічнай прамысловасці, якія аснашчаны перадавой навейшай тэхнікай, вызначаюцца вялікім асартыментам выпускаемай прадукцыі і глыбокай пастаноўкай навукова-даследчай работы. Тым самым яны прадстаўляюць вялікую каштоўнасць для праходжання практыкі студэнтаў-хімікаў.

Студэнты азнаёмяцца з ажыццяўленнем хімічных працэсаў ва ўмовах буйнай прамысловай вытворчасці, вывучаць важнейшыя схемы тэхналагічных працэсаў, апаратуру, кантроль вытворчасці, прымуць удзел ва ўдасканальванні існуючых і распрацоўцы новых тэхналагічных працэсаў, пазнаёмяцца са структурай прамысловых прадпрыемстваў, тэхнікай бяспекі, арганізацыяй працы на вытворчасці. Практыканты таксама будуць выконваць індывідуальныя заданні па вырабу асобных прэпаратаў, пачынаючы ад сыравіны і канчаючы кантролем і захаваннем гатовай прадукцыі.

Будучы на практыцы, студэнты праслухаюць лекцыі аб поспехах тэарэтычнай і прыкладной хіміі, азнаёмяцца ў парадку экскурсій з сумежнымі прадпрыемствамі.

Да кіраўніцтва вытворчай практыкай прыцягнуты вопытныя выкладчыкі (прафесар Ф. Г. Асіпенка, дацэнт А. С. Баркан), добра знаёмыя з тэхналогіяй вытворчасці арганічных і мінеральных рэчываў.

Невялікая частка студэнтаў праходзіць вытворчую практыку ў інстытуце хіміі Акадэміі навук БССР, пры кафедрах факультэта, якія працуюць па тэматыцы даследчых работ кафедры пад кіраўніцтвам прафесараў Н. Ф. Ярмоленкі і М. М. Паўлючэнкі.

Ёсць усе падставы меркаваць, што вытворчая практыка студэнтаў хімічнага факультэта ў бягучым навучальным годзе пройдзе арганізавана і прынясе вялікую карысць студэнтам у авалодванні ведамі ў галіне хіміі і хімічнай тэхналогіі.

Дэкан хімічнага факультэта
І. ЦІШЧАНКА.

Разведчыкі нетраў

Практыка на факультэце праводзіцца на ўсіх курсах. Тэрміны яе вялікія: ад 10 да 16 тыдняў у год. На першым і другім курсах праводзіцца вучэбная практыка. Але найбольш цікавай з'яўляецца вытворчая практыка на III і IV курсах.

Геолагі III курса паехалі ў розныя раёны краіны і будуць працаваць у геалагічных экспедыцыях і партыях па пошуку карысных выкапняў. Пяць чалавек паехала ў Кемераўскую вобласць. 10 чалавек—у Куйбышэўскую вобласць і 10—у паўночныя і заходнія вобласці Украіны. Невялікая група студэнтаў выехала ў раёны Еўрапейскай Поўначы СССР (Мурманская вобласць, Карэла-Фінская ССР, Комі АССР). Больш 20 чалавек будуць працаваць у Беларусі па разведцы карысных выкапняў і вывучэнню падземных вод рэспублікі.

Студэнты III курса аддзялення геаграфіі накіраваліся на вытворчую практыку ў раёны Каўказа. Там яны будуць вывучаць геалогію, геамарфалогію, расліннасць і асобныя галіны гаспадаркі, як Паўночнага Каўказа, так і Закаўказзя.

Студэнты IV курса аддзялення геаграфіі выехалі ў раёны Беларусі для прахаджэння праддыпломнай практыкі. Яны павінны сабраць матэрыял і даць апісанне прыроды і гаспадаркі асобных адміністратыўных раёнаў. Частка студэнтаў гэтага курса будзе займацца вывучэннем і апісаннем асобных калгасаў БССР.

Геолагі II курса адправіліся ў Прыкарпацце, дзе пройдуць практыку па геалагічнай здымцы. Першыя курсы аддзялення геалогіі і аддзялення геаграфіі і II курс аддзялення геаграфіі праходзяць вучэбную практыку ў Беларусі. На гэтым курсе практыка праводзіцца на глебазнаўству, батаніцы, эканамічнай і фізічнай геаграфіі і геадэзіі.

Н. РАМАНОЎСКІ,
дэкан геолага-геаграфічнага факультэта.

У ЧАС ЛЕТНІХ КАНІКУЛ

раз два—тры тыдні ў студэнтаў ончыцца экзаменацыйная сесія. ецца заслужаны летні адпачы- Добра напрацавалі, добра па- на і адпачыць. Прафком ужо зя паклапаціўся аб разумнай нізацыі адпачынку студэнтаў. шныя студэнты атрымаюць 46 вак ў дамы адпачынку: «Ждановы», «Блонь», «Орша», «Чонкі», енаградск». 18 студэнтаў змо- падлячыць здароўе, паехаўшы кія санаторыі, як «Кіславодск», лезнаводск», «Паланга», «Ба ск» і інш.

Акрамя таго, у гэтым годзе, як заўсёды, нашы студэнты прымуць удзел у турысцкіх і альпінісцкіх паходах. Большасць удзельнікаў—гэта студэнты, якія займаліся ў секцыі турызма-альпінізма: Сташонак, Войцік, Нядзелька, Скуман, Рэут і іншыя. Маршруты турысцкіх пуцёвак самыя рознастайныя: да возера Рыца, па Паўднёваму Крыму, па Ваенна-Сухумскай дарозе. 20 альпіністаў адправяцца ў лагер «Алібек».

Л. ЛЕЎЧЫК,
член прафкома.

* *

перыяд летніх канікул у клубе ерсітэта для студэнтаў, якія ацца ў Мінску, для завочні- паступаючых ва універсітэт ць наладжвацца розныя куль- масавыя мерапрыемствы. ынёва па аўторках будуць ацца лекцыі па гісторыка-партыйныя, прыродазнаўча-навуковыя і маладзёжныя тэмы; кожную сераду і пятніцу будуць дэманстравацца мастацкія і навукова-папулярныя кінофільмы; па суботах—экскурсіі і культпаходы ў тэатры, вечары адпачынку.

ХАЙ ДРУЖБА СТУДЭНТАЎ КВІТНЕЕ НА ВЕКІ

У гэтым нумары мы працягваем расказ аб жыцці і справах калектыва братняга Кіеўскага універсітэта

★ ★ ★

У кабінеце асноў марксізма-ленінізма

Веснавое сонца залівае яркімі праменямі прасторную чытальную залу. Пад іх ласкавым дотыкам загараюцца рубінам вокладкі кніг, якія ляжаць на сталах перад студэнтамі, золатам успыхваюць словы **Ленін, Сталін.**

Кабінет асноў марксізма-ленінізма—любімае месца самастойнай работы студэнтаў і выкладчыкаў. Ён абслугоўвае не толькі студэнтаў універсітэта, у ім працуюць таксама слухачы аднагадовых курсаў павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў сацыяльна-эканамічных дысцыплін і інстытута павышэння кваліфікацыі настаўнікаў.

Пастаянны састаў чытачоў кабінета перавышае тысячу чалавек. За 1953 год у ім пабывала звыш 33 тысяч чалавек. Ім было выдана каля 67 тысяч кніг, да 5 тысяч часопісаў і 8800 экземпляраў газет. А за чатыры месяцы бягучага года кабінет наведала ўжо звыш 16 тысяч чалавек.

Абедзве залы кабінета цудоўна афармлены. На сценах—табліцы, дыяграмы, малюнкі, якія ярка ілюструюць гераічны шлях Комуністычнай партыі. Да кожнага семінара, прадугледжанага вучэбнай праграмай, кабінет арганізуе выстаўкі літаратуры.

Бібліятэка кабінета налічвае кніг і перыёдыкі звыш 15 тысяч экземпляраў. Акрамя таго, яна пастаянна выкарыстоўвае фонд навуковай бібліятэкі універсітэта. Тут заўсёды можна хутка атрымаць патрэбную кнігу, часопіс, газету.

У кабінеце штодзённа дзяжурыць выкладчык, які растлумачвае студэнтам незразумелыя пытанні, дае кансультацыі, дапамагае рыхтавацца да экзаменаў.

Кабінет праводзіць вялікую работу і з аспірантамі. Супрацоўнікі яго дапамагаюць аспірантам падабраць літаратуру для напісання дысертацый, кансультуюць іх.

Пры кафедры асноў марксізма-ленінізма ёсць секцыя па рабоце з аспірантамі, куды ўваходзяць 9 вядучых выкладчыкаў. Штодзённа ў кабінеце праводзяцца паседжанні секцый з аспірантамі. На іх абмяркоўваюцца раздзелы дысертацый, даюцца ўказанні і г. д.

Асабліва напружана кіпіць работа ў кабінеце цяпер, у дні падрыхтоўкі да веснавой экзаменацыйнай сесіі. З раніцы да позняга вечара запоўнены чытальныя залы. Студэнты імкнуцца глыбока, грунтоўна вывучыць навуку навук--марксізм-ленінізм, і неацанімую дапамогу ім у гэтым аказваюць работнікі кабінета.

Б. БЕЙЛІН.

★ ★ ★

Совецкія пісьменнікі ў гасцях у студэнтаў Кіеўскага універсітэта.

★

У вольны час у студэнцкім інтэрнаце

Родным домам для студэнтаў стаў інтэрнат. Тут можна культурна адпачыць пасля заняткаў, у дружным калектыве сустрэць свята. Па-дамашняму хораша і ўтульна адчуваюць сябе ў інтэрнаце жыхары. У многім ім дапамагаюць партыйны, комсамольскі камітэты і прафком; аб многім яны паклапаціліся самі.

Студэнты, якія жывуць у інтэрнаце, рэгулярна атрымліваюць газеты і часопісы, іх разносяць падпісчыкам інтэрната. А ў ленінакоі да паслуг чытачоў заўсёды маюцца камплекты перыядычных выданняў.

У кожным пакоі маецца рэпрадуктар. Апошнія навіны, добры канцэрт, цікавыя перадачы па радыё заўсёды прыцягваюць увагу студэнтаў. Акрамя таго, у інтэрнаце маюцца тры радыёпрыёмнікі. Яны дастаюцца жыхарам лепшых пакояў. Гэта ўзнагарода за лепшую арганізацыю адпачынку, за чыстату ў пакоі і ўменне стварыць дамашнюю ўтульнасць.

Прафком універсітэта набыў для інтэрната тэлевізар. Для прагляду тэлевізійных радыёперадач як правіла збіраецца многа жадаючых. З вялікай цікавасцю праглядаюць яны новыя часопісы, фільмы, спектаклі, выступленні майстроў мастацтва.

На дагавору са студсоветам клуб чыгуначнікаў двойчы ў тыдзень забяспечвае інтэрнат кіноперасоўкай. Арганізоўваюцца таксама культпаходы ў тэатры і кіно. Аб набыцці білетаў загадзя клапоціцца студсовет. А пасля спектакля, па дарозе ў інтэрнат, шумная студэнцкая ватага абмяркоўвае ігру артыстаў, каштоўнасць і надзённасць п'есы.

Цікава бывае паслухаць добрую лекцыю—студсовет улічыў і гэтае жаданне студэнтаў. У гэтым яму дапамагаюць факультэцкія партыйныя арганізацыі. Яны прысылаюць у інтэрнат сваіх лектараў, у якіх можна атрымаць адказы на рознастайныя пытанні, хвалюючыя моладзь. З пачатку навучальнага года прачытана ўжо 12 лекцый: «Аб міжнародным становішчы», «Каханне, шлюб і сям'я ў совецкім грамадстве», «Выбары ў капіталістычных краінах—зброя ашукання і прыгнечання працоўных» і інш.

У вольны час можна таксама пагуляць у шашкі, шахматы, даміно, валейбол, павучыцца ў таварыша майстэрству ігры. А вечарамі гукі акардыёна ці радыёлы кружацца пары ў пакоі танцаў.

Вечары адпачынку ў інтэрнаце іграмі, танцамі, атракцыёнамі доўга застануцца ў памяці студэнтаў. На іх збіраюцца не толькі жыхары інтэрната, але і іх таварышы па курсах. Наладзіць такі вечар памагаюць камітэт ЛКСМУ універсітэта і прафком. Канцэртныя нумары на іх выконваюцца па сілах калектывамі мастацкай самадзейнасці факультэтаў.

Асабліва запомніўся ўсім новагодні вечар у студэнцкім інтэрнаце. Убраная, асветленая электрычнымі агнямі ёлка. Амаль такая-ж, як зіма, толькі большая і, магчыма, больш убраная, ды і сяброў і сяброўяе больш.

З цеплынёй і ўдзячнасцю будуць успамінаць выпускнікі універсітэта вясёлы студэнцкі адпачынак у сваім інтэрнаце.

Л. МАСКАЛЕНКА.

★

Матэрыялы гэтай старонкі арганізаваным калектывам рэдакцыі шматтыражнай газеты Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Г. Шэўчэнкі „За радянські кадри".

Майстры ручнога мяча

Адной з найбольш папулярных і масавых секцый ва універсітэце з'яўляецца баскетбольная секцыя. У ёй займаецца каля 120 чалавек. З іх—7 першаразраднікаў і 30 спартсменаў II разраду.

Тры разы на тыдзень студэнты трэніруюцца ў добраабсталяванай спортзале. Многа прыходзіцца працаваць трэнеру секцыі Ф. Л.Кузьменка, каб трэніроўкі праходзілі цікава і прыносілі як мага больш карысці удзельнікам.

Зімой баскетбалісты займаюцца на свежым паветры, робяць лыжныя вылазкі, летам займаюцца лёгкай атлетыкай.

Цяпер ва універсітэце будуецца летняя спартыўная пляцоўка, дзе члены секцыі баскетбола будуць праводзіць свае трэніроўкі і ігры.

У час зімовых канікул у Маскве адбылася таварыская сустрэча па баскетболу 4 універсітэтаў: Маскоўскага, Ленінградскага, Саратаўскага і Кіеўскага. На гэтых спаборніцтвах кіеўляне занялі трэцяе месца.

У красавіку праходзілі спаборніцтвы на першынство нашага універсітэта. У іх прымалі ўдзел 24 баскетбольных каманды 12 факультэтаў.

Мацнейшымі мужчынскімі камандамі аказаліся каманда геалагічнага факультэта і каманда філасофскага факультэта. Сярод жаночых каманд I месца заняла каманда юрыдычнага факультэта, у якой іграюць лепшыя баскетбалісткі універсітэта Эмілія Акопян і Светлана Міхайленка, II месца дасталося камандзе філалагічнага факультэта.

9 мая ў Кіеве пачаліся таварыскія сустрэчы, прысвечаныя 300-годдзю ўз'яднання Украіны з Расіяй.

Баскетбольная каманда КДУ, чэсць якой абаранялі лепшыя спартсмены Безрукаў, Сасюра, Пазенок, Ціляшчэнка, Квітко, Шыяноўскі, упершыню вышла на летнюю пляцоўку і выйграла сустрэчу з камандай сельскагаспадарчага інстытута гор. Сімферопаля з лікам 52 : 23.

Неўзабаве нашы баскетбалісты сустрэнуцца з лепшымі камандамі краіны.

Ю. РАТУШНЯК.



Валейбалісты КДУ ў час спаборніцтваў

ВА УНІВЕРСІТЭТАХ КРАІНЫ

(па старонках шматтыражных газет)

Падаўна ў студэнтаў Кішынёўскага універсітэта пабываў паэт С. П. Шчыпачоў. Студэнты цёпла сустрэлі свайго дарагога госця.

На вечары С. П. Шчыпачоў падзяліўся сваімі творчымі планамі, прачытаў рад сваіх твораў.

Памяці загінуўшых у баю сяброў прысвечан верш «Наўшым». Затым паэт чытае лірычны летапіс вайны—ад тых пяці мінут, якія аддзялілі мір ад вайны, да радаснага дня перамогі. Гімнам жыцця, вернасці і прыгажосці гучаць радкі любві, адрасаваныя моладзі. Юнакі і дзяўчаты, запоўніўшыя зал, успрымаюць іх, як запаветы і парады.

Разам з С. Шчыпачовым на вечары сустрэчы са студэнтамі універсітэта былі пісьменнікі і паэты Е. Златава, А. Лупан, Л. Дзеляну, Ем. Букаў.

«Сталинец» г. Кішынёў.

Комсамольцы II курса філалагічнага факультэта Саратаўскага дзяржаўнага універсітэта ў адказ на заклік партыі яшчэ вышэй узняць узровень сельскай гаспадаркі краіны звярнуліся да ўсіх студэнтаў універсітэта са зваротам паехаць пасля заканчэння летняй экзаменацыйнай сесіі на 10 дзён у калгасы падшэфнага раёна для дапамогі палявых работах.

Камітэт комсамола падхапіў пачынаўную ініцыятыву комсамольцаў і абмеркаваў іх пачын на ўсіх комсамольскіх сходах.

«Сталинец» г. Саратаў.

Закончылася III традыцыйная стрэча сяброўства двух ВНУ універсітэтаў. Яна паслужыла мацненню сяброўскіх сувязей студэнтаў буйнейшых ВНУ Казахстана і Кіргізіі.

«За отличную учебу» г. Алма-

Літаратурная старонка

★ ★ ★

З твораў, дасланых на конкурс

Д. СІМАНОВІЧ

ДОМ НА ДОРОГЕ БЕССМЕРТИЯ

Одна из школ Бухареста носит
имя Зои Космодемьянской.

огда она не была здесь
е думала,
о Дорога Бессмертия
ак далека—
рез тихие степи
ацы шумные,
рез годы,
вущие, как облака.
лака...
жет те, что—
око ли, низко ли—
Петрищева шли,
успев отдохнуть,
уг замедлят и вспомнят
школой румынскою
ле подмосковном,
начали путь.
школа
звонит звонками обычными,
ки замирают,
да под салют
од горн золотой
три дежурных-отличницы
три букета
к большому портрету
несут.
И целуют портрет,
как знамена
положено
целовать,
прикоснувшись губами на миг.
А с портрета—
чуть-чуть на румынку
похожая—
улыбается Зоя
и смотрит на них.
Никогда она не была здесь...
Над каштанами
облака розовеют,
встречая рассвет,
и всё дальше плывут
над морями и странами.
И конца
У Дороги Бессмертия
нет.

Прощание с детством

тно стоит на пороге
чка с черной косою—
собралось в дорогу
тво моё золотое.
тво!..
но и горько,
не вернёшься
мне ты,
но взбираюсь на гору,
ка с которой
нету.
ько всё выше и выше
ка крутая уводит
нку детства
ь слышно
енний ветер доносит,
то внизу, над рекою,
льный звонок затихает,
девочка с черной косою,
двери раскрыв, выбегает.
Ей одноклассник вихрастый
снегом бросает вдогонку...
„Детство счастливое,
здравствуй!“—
крикнуть
мне хочется
звонко.
„Детство!„—
А тропка всё шире...
„Здравствуй!“—
А надо прощаться...
Манят огнями
вершины—
юность зовёт
подниматься.

И ПОЧЕМУ ЭТО ТАК ПОЛУЧАЕТСЯ...

очему это так получается?
ушку встретить хочу.
а она, как назло,
встречается,
олько её не ищу.
ень опять золотою косынкою
ну одела к зиме.
ж мое счастье?
кою тропинкою
дит око по земле?
Я бы тропинку засыпал
букетами,
сердце бы там положил,
самые лучшие,
самые светлые
ей бы стихи посвятил.
Только она, как назло,
не встречается,
словно боится меня...
И почему это так
получается?—
Кто мне ответит, друзья?

★



Фотоэцюд студэнткі IV курса біёлага-глебавага факультэта Алы Бандарчук (са здымкаў, дасланых на конкурс).

★

В. ТАРАС

ПАЭТ І ДОМ

(пародыя)

Сталічны, жыллёвы,
Пяціпавярховы,
Быў дом пабудаваны
Датэрмінова.

У доме у гэтым
Усё зроблена лоўка...
Як раптам паэта
Прыходзіць з алоўкам.

З кішэні дастаў ён
Кавалак паперы,
Абмацаў старанна
І вокны, і дзверы.

Намацаўшы гэткую
Добрую тэму,
Не сходзячы з месца,
Пачаў ён паэму.

З вялікім натхненнем,
З вялікім стараннем
Паведаміў нам ён
Пра абсталяванне.

Што тут—
Электрычных лямпачак многа,
Што зроблена з дрэва
У доме падлога.

Што новы той дом,
Як і дом супроцьлеглы,
Зрабілі—з чаго-бы вы думалі?—
З цэглы!

Печы у доме
Зрабілі таксама.
Есць каля дома
Шырокая брама.

Унізе—пад мурам—
Знаходзіцца глеба,
А зверху знаходзяцца
Сонца і неба!

І ў самым канцы,
Калі быў ён у стоме,
Успомніў,
Што людзі жывуць у тым доме.

ВЕСЕННЯЯ СКАЗКА

Шла весна, как маляр-
волшебник,
по дорогам земного шара,
поднимая высоко в небо
языки зеленых пожаров.
Травку каждую, каждый
листик
красил бережно и влюблённо
тот маляр,
что чудесной кистью
сделал землю такой зеленой.
Он полям пожелал удачи,
улыбнулся рождённой сказке.
Только небо осталось мрачным:
нехватило зеленой краски.
И маляр, подумав немного,
чтоб никто не сказал, что
скуп он,
кисть макнул в голубую Волгу
и покрасил небесный купол.
Посмотрел на простор
широкий,
на огни небывалых строек
и, собравшись опять в дорогу,
кисть обмыл прозрачной росою.
А потом—совсем не для
славы—
расписался звёздною строчкой
и на самом восходе поставил
ярким солнцем
огромную точку.
И пошел дорогою вешней...
А земля начинала утро.
Засветились в лучах скворешни
словно были из перламутра.
Окна нового дома
лукаво
подмигнули:
„Попробуй, дотронься!—
нам стекольщик недаром
вставил
золотые кусочки солнца“
Липа стала от злости шире:
„Ишь, расхвастались перед
светом,
будто их везли на машине,
как меня, на улицу эту.“
Пробегал мальчишка веселый
мимо липы зеленокудрой
и у самого входа в школу
крикнул звонко:
„Доброе утро!“

„Творчасць журналіста“

Выйшаў чарговы, шосты нумар альманаха «Творчасць журналіста». Прыемна адзначыць, што ў гэтага нумара адпавядае назве альманаха. Мы маем перад сабой трыбуна творчасць будучых журналістаў, студэнтаў нашага аддзялення. Новы нумар выгадна адрозніваецца ад мінулагодніх «хударлявых» папярэднікаў і свасёй ёмкасцю. Змест нумара рознастайны: прадстаўлена навуковая работа студэнтаў, змешчаны нарысы, апавяданні, вершы, ёсць крытыка і бібліяграфія.

Нумар адкрываецца артыкулам Міцкевіча «Аб нашай прафесіі». Ён дзеліцца цікавымі думкамі аб рабоце журналіста, аб якасцях, якімі павінен валодаць прадстаўнік савецкага друку: прынцыповасцю, сумленнасцю за даручаную справу, творчым пошукам новага.

Спынімся на прозе альманаха, якая займае ў ім віднае месца. Добрае ўражанне пакідаюць нарысы А. Фомчанкі—студэнта I курса. Адзін з іх—«Сустрэча»—прысвечаны калгаснай вёсцы, другі—«На заводзе»—маладой перадавой работніцы Мінскага трактарнага завода. Лепшая якасць нарысаў Фомчанкі—тое, што ў іх мы бачым жывых людзей. Аўтар валодае вельмі каштоўным дарам для журналіста—назіральнасцю. Ён знаходзіць часам трапныя дэталі для характарыстык, свайго героя, для паказу яго ўнутранага свету.

Але нельга не адзначыць і некаторыя істотныя недахопы нарысаў. Аўтар не заўсёды ўмела адбірае матэрыял, выдзяляе галоўнае і падпарадкоўвае яму другараднае. Асабліва гэта характэрна для нарыса «Сустрэча».

Аўтар свабодна валодае мовай. Але для яго характэрна пашыраная сярод многіх нас хвароба—пагоня за прыгожым словам, за кудраватымі выразамі. Напрыклад, ён піша: «Вспаханные на глубину восемнадцати сантиметров, вместо двадцати двух, гектары жгучим стыдом ложились на его совесть». («Встреча»). Не пазбаўлены нарысы і стылістычных хібаў. **«Всё трудное у нас делают машины, механизация, сразу все пропали горе-волнения».**

З цікавасцю чытаюцца нататкі І. Хаўратовіча «У краю запаведнага звера». Тэма іх—светлыя, радасныя дні летняга адпачынку піянераў. Напісаны нататкі жывой мастацкай мовай. Добра перададзены паводзіны, мова дзяцей і іх адносіны да навакольнага жыцця. Аўтар удала выкарыстоўвае эпізод сустрэчы дзяцей з калгасным брыгадзірам і яго расказ аб тым, як партызаны баранілі баброў ад немцаў.

Але Хаўратовіч да канца не аформіў свае нататкі кампазіцыйна, некалькі параскідаў матэрыялы, у выніку чаго стварылася ўражанне незакончанага апавядання.

Уласна мастацкая проза прадстаўлена ў альманаху апавяданнямі Е. Каршукова і невялікімі апавяданнямі-фельетонамі А. Сталюгі. Суадносіны грамадскага і асабістага, першае выпрабаванне для кахання ў сувязі з гэтымі суадносінамі—такая тэма апавядання Каршукова «Праздничный номер». Героі апавядання—студэнты. Добра напісана сцэна сустрэчы Люды з Міхаілам на катку. Вязлікім атрымаўся толькі вобраз Міхаіла, у якога няма свайго жывых рысаў.

Сам факт наяўлення маленькіх фельетонаў Сталюгі трэба толькі вітаць. Многа яшчэ ў нашым студэнцкім асяроддзі ціны, гнілі і цвілі, якія трэба выкрываць сродкамі сатыры. Нажаль, фельетоны яшчэ не дасягаюць мэты, б'юць міма цэлі. Ім нехапае вострай выкрывальнай сілы. Яны вельмі ўжо «смешныя», многа ў іх дэталяў, разлічаных на знешні эфект, а не на паказ сутнасці з'явы.

Нягледзячы на тое, што ў вершах Адамчыка, (аддзел паэзіі) ёсць трапныя дэталі, ім усё-ж такі нехапае акрэсленай, аўтарскай, мастацкай задумы. Гэта асабліва сказалася ў вершы «Восень». Верш Харкевіча «Заслонаўцы» значна выйграў-бы, калі-б ён быў больш кампактным па сваёй будове, калі-б у ім было менш дэкларатыўнасці.

Пераклад верша «Да таварыша вязня» выдатнага польскага паэта В. Брацеўскага, зроблены студэнтам III курса А. Мальдзісам, захоўвае баявы пафас, палымянасць і мастацкія вартасці арыгінала. Толькі вось дрэнна, што рэдкалегія зрабіла дрэнную паслугу і самому арыгіналу і яго перакладу, выкінуўшы з верша прадапошнюю страфу.

Крытыка і бібліяграфія прадстаўлены ў альманаху рэцэнзіяй Р. Платонава («Нарысы Коласава на калгасныя тэмы»), рэцэнзіяй А. Волка і Д. Мацяса на раман Куляшова «Растанемся не надоўга». («Стварыць поўнакроўныя вобразы»).

Студэнт V курса Краснюк змясціў рэцэнзію на паэму Твардоўскага «За далью-даль», выпускніца Варывончык—рэцэнзію на кінофільм «Новы Мінск». Закрываючы апошнюю старонку альманаха, прызнаешся, што прачытаў яго з цікавасцю і карысцю.

А. ВЯРЦІНСКІ.

Вынікі універсітэцкай спартакіяды

14 мая спаборніцтвамі па лёгкай атлетыцы закончылася 2-я круглагадовая спартакіяда студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. У спартакіяду былі ўключаны 11 спаборніцтваў па 9 відах спорту: лёгкая атлетыка, гімнастыка, лыжы, канькі, валейбол, баскетбол, плаванне, стральба, шахматы. Усяго ў спартакіядзе прыняло ўдзел каля паўтары тысячы чалавек. У ходзе спартакіяды былі паказаны 121 вынік 3-га спартыўнага разраду і 58 вынікаў 2-га спартыўнага разраду.

Месцы сярод факультэтаў размеркаваліся наступным чынам:

На 1 месца вышла каманда гістарычнага факультэта, на 2 месца—каманда геолага-геаграфічнага факультэта, 3 месца—фізмат, 4 месца—хімфак, 5 месца — аддзяленне журналістыкі, 6 месца — біяфак, 7 месца—філфак.

Спартакіяда праводзілася па новаму палажэнню, якое прадугледжвала залік адпаведна колькаснаму саставу студэнтаў на факультэце. Такі залік дазволіў факультэтам з малалікім саставам студэнтаў выступаць на роўных правах і магчымасцях з буйнымі факультэтамі.

Так, калі па лёгкай атлетыцы для хімічнага факультэта каманда павінна была складацца з 25 чалавек, то каманда самага большага—фізіка-матэматычнага факультэта — з 45 чалавек.

Вялікіх поспехаў у спартакіядзе дабіліся гістарычны і геолага-геаграфічны факультэты, заняўшыя па чатыры першых месцы ў спаборніцтвах па асобных відах спорту. Гістфак: па кросу, лёгкай атлетыцы, лёгкай атлетыцы ў зімовых умовах і гімнастыцы. Геафак: па стральбе, каньках, плаванню, баскетболу.

Поспех гістарычнага факультэта заключаецца ў добрай рабоце фізкультурнага актыву, арганізаванасці і дысцыпліне. На факультэтах рэгулярна займаліся секцыі лёгкай атлетыкі, валейбола, баскетбола. Кіравалі секцыямі грамадскія інструктары (В. Русак,— валейбольнай, І. Пракаповіч—баскетбольнай). Вялікую арганізацыйную работу правялі фізкультурнае бюро факультэта, адказны за факультэт выкладчык кафедры фізвыхавання В. Шапялевіч і дэканат факультэта. Фізіка-матэматычны факультэт — пераможца спартакіяды мінулага года,—пастаўлены ва ўмовы павялічанага заліку, заняў толькі два першыя месцы (па лыжах і шахматах).

На фізмаце дрэнна абстаіць справа з развіццём баскетбола, гімнастыкі. Факультэт у спартакіядзе заняў 5 месца па баскетболу і 4 па гімнастыцы. На факультэце не звярнулі ўвагі на папаўненне гімнастаў з ліку студэнтаў малодшых курсаў. а мінулагоднія чэмпіёны Чубчанка, Ваулін і інш. скончылі універсітэт.

Асобна неабходна спыніцца на ўдзеле ў спартакіядзе каманд біёлага-глебавага і філалагічнага факультэтаў. Калі на біялагічным факультэце праводзілася некаторая работа па стральбе і валейболу, дык аб філфаку нельга сказаць і гэтага. Толькі па баскетболу філфак заняў 4 месца, а па ўсіх іншых відах спорту факультэт займае апошнія ці перадапошнія месцы. Факультэт мала накіроўваў сваіх студэнтаў для заняткаў у секцыях, а фізкультурны калектыў факультэта малалікі і, натуральна, у сілу сваёй малалікасці узяць усю работу не змог. Адказны за факультэт ад кафедры фізвыхавання выкладчык т. Іпчанка недастаткова ўдзяляў увагі фізкультурнай рабоце на факультэце.

В. ХРЭНАЎ, старшы выкладчык кафедры фізвыхавання.

БОЛЬШ ДАПАМОГІ КАЛГАСУ „КОМІНТЭРН“

Вераснёўскі і лютаўска-сакавіцкі Пленумы ЦК КПСС прынялі рашэнне аб крутым уздыме сельскай гаспадаркі, аб павелічэнні вытворчасці прадуктаў шырокага ўжытку і сыравіны для прамысловасці. Комуністычная партыя паставіла перад усімі партыйнымі і совецкімі арганізацыямі, перад усім совецкім народам задачу аказання ўсебаковай дапамогі працаўнікам калгаснай вёскі.

Ідучы па шляху выканання ўказанняў ЦК, прадпрыемствы і вышэйшыя навучальныя ўстановы ўзялі шэфства над калгасамі, якім аказваюць усебаковую дапамогу.

Наш універсітэт шэфствуе над калгасам «Комінтэрн» Дзержынскага раёна Мінскай вобласці.

За апошні час студэнтамі універсітэта прачытана для калгаснікаў сельгасарцелі «Комінтэрн» звыш 40 дакладаў на навуковыя і сельскагаспадарчыя тэмы. Чатыры разы выязджалі ў калгас агітбрыгады фізіка-матэматычнага і гістарычнага факультэтаў.

Значную работу ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы правялі прафесар П. А. Дарожкін і дацэнт С. В. Калішэвіч, якія некалькі разоў выязджалі ў калгас. Вялікая работа была праведзена кафедрай фізічнага выхавання і спорту ў палепшанні фізкультурнай работы сярод калгаснай моладзі Студэнтамі сабрана і перадана для калгаснай бібліятэкі звыш 1200 кніг, а біялагічным факультэтам сабрана тэхнічная і сельскагаспадарчая літаратура.

Студэнтамі універсітэта зроблена 6 выездаў групамі ў 25—30 чалавек і больш для аказання дапамогі пры пасадцы бульбы. Выезды такіх брыгад маюць вялікае значэнне не толькі ў тым сэнсе, што яны дапамаглі калгаснікам завяршыць веснавую сяўбу, але і ў тым, што яны аказалі станоўчы ўплыў на рост актыўнасці і ініцыятывы калгаснікаў. Партыйнае бюро і рэктарат павінны і ў далейшым прыняць усе меры для таго, каб такія брыгады сістэматычна выязджалі ў калгас і ў перыяд уборачнай кампаніі.

Але нягледзячы на ўсё зробленае, шэфская работа мае яшчэ многа недахопаў, якія павінны быць ліквідаваны ў самы бліжэйшы час. Галоўным недахопам у шэфскай рабоце, як адзначыў т. Малышаў у сваім дакладзе на партыйным сходзе БДУ, які адбыўся 20 мая,—з'яўляецца тое, што вельмі мала дапамогі аказваецца калгасам з боку навуковых работнікаў і зусім адсутнічае яна з боку нашых аспірантаў. Гэты недахоп сказваецца ў тым, што вучоныя універсітэта яшчэ рэдка выязджаюць у калгас з лекцыямі і дакладамі, аказваюць слабую практычную дапамогу хлебаробам.

Партыйны сход універсітэта заслухаў даклад «Аб стане і мерах паляпшання шэфскай работы над калгасам «Комінтэрн». Сход патрабаваў ад кафедраў універсітэта палепшыць работу непасрэдна ў калгасе.

Так, кафедры біёлага-глебавага факультэта (глебазнаўства, сістэматыкі, фізіялогіі раслін і інш.) павінны дапамагчы правільна выкарыстаць матэрыяльныя рэсурсы калгаса, арганізаваць правільныя севазвароты, дапамагчы стварыць трывалую кармавую базу, наладзіць агразааатэхнічную вучобу калгаснікаў.

Кафедра палітэканоміі (заг. дацэнт В. А. Тамашэвіч) займаецца вучэннем эканамічнага стану калгаса і намячае шляхі ўмацавання эканамічнай базы і павышэння працадня калгасніка. Кафедры і практыкі совецкага права (заг. кафедры дацэнт М. С. Зярнін) і партарганізацыя філфака аргазуюць у калгасе рэгулярны насценнай газеты.

Бібліятэка універсітэта аказала дапамогу калгасу ў камплектаванні спецыяльных бібліятэчак і перадаць у парадак літаратуру, якая раней перадана калгасу.

Неабходна адзначыць недасведы ўдзел камітэта комсамола універсітэта ў канкрэтнай дапамозе калгасу «Комінтэрн». Да сучаснага моманту не наладжана работа самольскай арганізацыі калгаса.

Абавязак партыйных, комсамольскіх, прафсаюзных арганізацый таксама ўсяго калектыва работнікаў універсітэта—паўсядзённа дамагацца за выкананне рашэнняў чарговага партыйнага сходу універсітэта.

А. АКІНЧЫЦ
І. ДАРАШКЕВІЧ

ПАРАДЫ ЎРАЧА

Як уберагчыся ад кішэчных захворванняў

Дызентэрыя і брушны тыф—заразныя хваробы. Яны перадаюцца асобнымі мікробамі, якія пранікаюць у арганізм праз рот з брудных рук, бруднай пасуды разам з харчамі ці напіткамі. Для таго, каб уберагчыся ад дызентэрыі і брушнога тыфу, патрэбна не даваць магчымасці гэтым мікробам пранікнуць у арганізм.

Страўнікава-кішэчныя захворванні сустракаюцца круглы год, але летам колькасць іх рэзка павялічваецца. Чаму гэта адбываецца?

Летам паяўляецца многа мух, якія разносяць мікробы, выклікаючыя страўнікава-кішэчныя захворванні. Значыць, знішчэнне мух—барацьба за здароўе.

Часта ў гарачыя дні людзі п'юць нядобраякасную ваду, у якой могуць быць хваробатворныя мікробы Не ўжываць такой вады, заўсёды мыць рукі перад ядой і прыгатаваннем ежы—важнейшыя ўмовы збярожэння арганізма ад захворванняў. Нездарма-ж дызентэрыю і брушны тыф называюць хваробамі брудных рук. Неабходна сачыць за чыстатой харчовых прадуктаў, асабліва гародніны і фруктаў. Пасля яды патрэбна прыбіраць стол і мыць пасуду адразу-ж. Кроўкі і аб'едкі патрэбна змятаць са стала і выкідаць у вядро для смецця, якое павінна быць заўсёды закрыта і апаражняцца штодзённа.

Таксама патрэбна памятаць, што заразіцца можна не толькі ад хворых, але і ад бацыланосьбітаў. Так называюць людзей, якія перанеслі заразную хваробу, папраўліся, але працягваюць выдзяляць мікробаў. Бывае, што яны і самі гэтага не прымячаюць, а ўстанавіць іх заразнасць для акружаючых можна толькі лабараторным шляхам. Пры паяўленні паноса ці павышэнні тэмпературы неабходна паказацца ўрачу і выконваць усе яго ўказанні. Лячыцца патрэбна не дамашнімі лякарствамі па ўласнаму выбару—гэтым можна нанесці свайму здароўю шкоду,—а толькі па ўказаннях урача.

У гарачыню асабліва хутка псуюцца малочныя прадукты, варэныя каўбасы, адчыненыя кансервы, рыба, мяса. Ужыванне ў ежу такіх сапсаваных прадуктаў можа выклікаць страўнікава-кішэчныя захворванні. Прадукты, якія хутка псуюцца, не варта гатовіць у вялікай колькасці. Хаваць іх патрэбна ў халодных месцах: у тазе з вадой, халадзільніках.

Умовай паспяховага прадухілення людзей ад захворвання дызентэрыяй і брушным тыфам з'яўляюцца прывіўкі.

О. Г. ВАЙЦЭХОВІЧ,
урач БДУ.

Зарваўшыйся крытыкан

Іван Пісарэнка ходзіць размашыста і прыгожа гаворыць. Але не гэтым праславіўся Іван. Што датычыць вачэй... О! якія гэта цікавыя вочы! Іх промні быццам у фокусе даюць адваротныя адбіткі: ляжыць белае, а ў вачах Івана—чорнае. А займаецца гэты чалавек з рэдкасными вачыма на II курсе аддзялення рускай мовы і літаратуры.

...Студэнты, праслухаўшы лекцыю прафесара Гутарава, вышлі ў калідор, дзелячыся ўражаннямі. Іван-жа, засунуўшы рукі ў кішэні і многазначна чмыхаючы ў нос, паўтараў:

— Гутараў не ведае літаратуры! Гутараў не ведае літаратуры!

Агарошаныя студэнты не ведалі, што і адказаць новаяўленаму крытыкану. А той, падбадзёраны маўчаннем студэнтаў, пачаў перабудоўвацца ад заспіннага, закуліснага крытыканства да публічнага.

Незадачлівы крытыкан у хуткім часе пераканаўся, што яму ўсё дазволена, бо ў яго ў кішэні ляжыць партыйны білет. Івана можна было бачыць на многіх трыбунах, адкуль ён выліваў у аўдыторыю патокі бруду і хлуснi. Даверлівыя слухачы толькі галовамі ківалі, але баяліся паказаць хлусніку яго сапраўднае месца. Паганае зерне крытыканства, багата ўгноенае патураннем грамадскасці, узышло і закаласілася ў душы Івана. Яму ўжо было мала «крытыкаваць» выкладчыкаў свайго аддзялення. Відаць, хлуснеабільная душа Івана прасіла разгону. Чарговым аб'ектам зневажання ён выбраў т. Чарнову, выкладчыцу рускай літаратуры на аддзяленні журналістыкі.

— Знішчу,—хваліўся ён аднакурснікам і жонцы. І вось, нікелі не слухаўшы лекцый т. Чарновай, Іван на партыйным сходзе зачэрпнуў з сваёй душы вядро бруду і выліў яго на галаву сумленнага выкладчыка. Захлёбваючыся ад ўласнага красамоўства, крытыкан гаварыў, што студэнты не хочуць слухаць Чарновай, што студэнты III курса аддзялення журналістыкі байкатуюць лекцыі Чарновай, што яны ў знак пратэсту арганізавана ўсталі і вышлі з аўдыторыі, калі Чарнова чытала лекцыі. Няма чаго і гаварыць, якое абурэнне студэнтаў гэтага курса выклікала чарговая хлусня распаясаўшагася Івана. Студэнты III курса аддзялення журналістыкі любяць лекцыі т. Чарновай, і слухаюць іх з неаслабнай увагай. Толькі на дзве лекцыі яны не змаглі прыйсці ў выніку напісання курсавых работ, здачы ўнеаўдыторнага чытання па замежнай мове і залікаў.

Ці нельга-ж шляхам суровай крытыкі вытравіць з душы Пісарэнкі шкодныя сарнякі і пустазелле?..

З. ЮР'ЕЎ.

ФАКТ БЕЗ КАМЕНТАРЫЯЎ

Кажуць, што Анатолій Кліцуноў добры спартсмен. З гэтым нельга не згадзіцца.

Але паглядзіце, якія ён робіць зусім не спартыўныя выхадкі і сценамі універсітэта. Прадаставім слова начальніку 5 аддзялення міліцыі т. Кунцэвічу:

«18 мая 1954 г. студэнт I курса геолага-геаграфічнага факультэта Кліцуноў А. С. знаходзячыся ў цвярозым становішчы ўчыніў дробнае хуліганскае дзеянне: дал у аўтобусе: абарваў сядзенні, разламаў дзверы, за што быў затрыманы і дастаўлен у 5-е аддзяленне міліцыі г. Мінска.

За парушэнне грамадскага парадку на яго быў складзен адміністратыўны акт аб спагнанні штрафу.

Прашу Вас уздзейнічаць на яго ў адміністратыўным і грамадскім парадку».

Далучаючыся да гэтай просьбы, «Вожык» удакладняе адрас: студэнт самольскай арганізацыі 1 курса аддзялення геаграфіі.

З павагай «Вожык».

Рэдактар А. ВОЛК.

АМ 52933 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Зак. 413 Тыр. 1000